УДК 808.26

# Некаторыя аспекты вывучэння тэрміналагічнай лексікі на занятках па беларускай мове са студэнтамі архітэктурных спецыяльнасцей

Сахончык А.П., Гіруцкая Л.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Сучасная прафесійная адукацыя прызначана забяспечыць такую падачу вучэбнага матэрыялу, якая навучыла б студэнтаў самастойна разважаць і выказвацца ў любых прафесійных сітуацыях. Вывучэнне дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” накіравана на пашырэнне кругагляду, станаўленне асобы і фарміраванне светапогляду, што звязана з эфектыўнасцю дзейнасці ў будучай прафесійнай сферы спецыялістаў.

Вывучэнне тэкстаў па спецыяльнасці з’яўляецца для студэнтаў архітэктурных спецыяльнасцей неабходным відам маўленчай дзейнасці. Тэксты павінны быць звязаны з вучэбным матэрыялам па профільных дысцыплінах і па спецыяльнасці, напоўнены спецыяльнымі словамі-тэрмінамі. Гэта падводзіць студэнтаў да вывучэння тэм па профільных прадметах, знаёміць з прафесійнай лексікай. Сістэма работы над тэрміналогіяй мае вялікае значэнне, паколькі звязана з пашырэннем сферы функцыянавання беларускай мовы не толькі ў адукацыйнай, але і культурнай галіне.

На першым этапе задача выкладчыка заключаецца ў тым, каб студэнты засвоілі тэарэтычны і практычны матэрыял па наступных пытаннях: паняцце тэрміна і тэрміналогіі, паходжанне і ўтварэнне тэрмінаў, лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў, спецыфічныя семантычныя працэсы ў сучаснай тэрміналогіі, асаблівасці перакладу спецыяльных тэкстаў з рускай мовы на беларускую і наадварот. Вынікам працы на гэтым этапе з’яўляецца складанне мінімуму тлумачальнага слоўніка архітэктурных тэрмінаў.

На другім этапе студэнтам прапаноўваецца самастойна выбраць від работы (вуснае паведамленне ці прэзентацыя з выкарыстаннем раздатачнага і ілюстрацыйнага матэрыялу і рэферат) па дзвюх агульных тэмах – “З гісторыі беларускай (сусветнай) архітэктуры” і “Праект маёй мары” (рэгламентуюцца аб’ём, час выступлення і мінімальная колькасць ужытых тэрмінаў). Навучыць студэнта дакладна і ясна абгрунтоўваць свае думкі, лагічна будаваць сваё выказванне, прыводзіць неабходныя доказы, даваць ацэнку той ці іншай навуковай інфармацыі, перадаваць асноўны змест прачытанага ці праслуханага тэксту – менавіта на гэта павінна быць накіравана навучанне беларускай мове ў ВНУ негуманітарнага профілю.